Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ХАРАВЫ КЛАС

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць*
*(харавая музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-01 01 Харавая музыка акадэмічная*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*А.В.Пякуцька*, загадчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, прафесар;

*Я.М.Рэутовіч,* прафесар кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, прафесар;

*А.А.Свірыдовіч*, дацэнт кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* харавога дырыжыравання ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”;

*М.П.Дрынеўскі*, кіраўнік дзяржаўнай установы “Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча”, прафесар, народны артыст Беларусі

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 04.11.2009 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 10.11.2009 г.);

*навукова-метадычным* саветам па народнай творчасці Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 13.11. 2009 г.)

Адказны за рэдакцыю *І.В.Смяян*
Адказны за выпуск *А.В.Пякуцька*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма “Харавы клас” распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 “народная творчасць (харавая музыка)”.

У працэсе падрыхтоўкі студэнтаў па спецыялізацыі “харавая музыка акадэмічная” курс харавога класа займае адно з асноўных месцаў.

*Асноўная мэта дысцыпліны* – фарміраванне творчай асобы кіраўніка харавога калектыву, выкладчыка харавых дысцыплін.

*Асноўныя задачы дысцыпліны:*

– развіццё ўменняў і навыкаў, неабходных для практычнай работы з харавым калектывам;

– выхаванне любові і цікавасці да харавога мастацтва ў працэсе практычнага знаёмства з лепшымі харавымі творамі розных эпох, стыляў, жанраў;

– развіццё мастацкага густу, эмацыянальнасці, меладычнага і гарманічнага слыху, навыкаў інтанавання, фарміраванне правільнага пеўчага дыхання, гукаўтварэння.

Дысцыпліна “Харавы клас” базіруецца ў першую чаргу на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні дысцыплін “Хоразнаўства”, “Методыка работы з хорам”, “Методыка выкладання спецдысцыплін”, “Сальфеджыа і тэорыя музыкі” (гармонія, поліфанія, аналіз музычных формаў).

У выніку вывучэння дысцыпліны спецыяліст павінен *ведаць:*

– тыпы і віды хароў,

– спецыфіку агульнай харавой работы па групах,

– асаблівасці, выразныя мастацкія магчымасці харавых галасоў,

– харавыя партыі вывучаемых твораў,

– прынцыпы фарміравання харавога калектыву,

– задачы вакальна-харавых распяванняў,

– метады выхавання вакальна-харавых навыкаў,

– прынцыпы падбору вучэбнага і канцэртнага рэпертуару для харавога калектыву;

*умець:*

– свабодна карыстацца асноўнымі сродкамі дырыжорскай тэхнікі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– правесці агульную рэпетыцыю хору,

– аналізаваць і інтэрпрэтаваць нотны тэкст,

– працаваць з харавой групай,

– асэнсоўваць сваю партыю як частку цэлага, чуць сябе і сваіх партнёраў па партыі,

– дасягаць вакальнага ансамбля ўсіх выканаўцаў,

– валодаць вакальна-харавымі і музыкальна-слыхавымі навыкамі: пеўчым дыханнем, вакальным гукам, дакладнай інтанацыяй, выразнай дыкцыяй, пачуццём рытму,

– падбіраць вакальна-харавыя практыкаванні для распявання хору,

– праслухоўваць галасы, вызначаць музыкальна-слыхавыя і вакальныя даныя спевака,

– працаваць з харавой партыяй, харавымі групамі і з усім харавым калектывам,

– падбіраць высокамастацкі рэпертуар для харавога калектыву.

Для будучых харавых спевакоў і дырыжораў спевы ў харавым класе абавязковыя на працягу ўсяго навучання ў ВНУ. Менавіта на практычных занятках студэнты найбольш поўна далучаюцца да харавога мастацтва, удасканальваецца іх выхаванне як кваліфікаваных музыкантаў.

Заняткі ў харавым класе садзейнічаюць развіццю музыкальных здольнасцей: павышаецца вастрыня музыкальнага і гарманічнага слыху (асабліва пры спевах a cappella), развіваюцца музыкальная памяць, пачуццё рытму, удасканальваюцца пачуццё ансамбля і ўменне спяваць у ансамблі.

Задачы харавога класа вырашаюцца на аснове вывучэння лепшых узораў харавой літаратуры розных эпох, стыляў, жанраў, а таксама народнапесеннай творчасці. Гэтыя задачы ўскладняюцца ад курса да курса на матэрыяле тэм, прапанаваных у плане. Работа над тэмамі пачынаецца на І курсе, працягваецца на наступных і заканчваецца на V курсе. На базе сістэмнага падыходу да зместу і відаў вучэбнай дзейнасці будуецца сістэма вучэбных і практычных заняткаў са студэнтамі ад непасрэднага ўспрымання, аналізу, эмацыянальна-эстэтычнай ацэнкі, тэарэтычных мастацка-эстэтычных меркаванняў да іх рэалізацыі ў музычна-харавой практыцы.

Дысцыпліна “Харавы клас” разлічана на пяцігадовы тэрмін навучання. Тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дыс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыпліны адведзена ўсяго 1890 гадзін, у тым ліку 970 гадзін аўдыторных заняткаў, якія з’яўляюцца практычнымі (у поўным складзе і па харавых групах). Аб’ём работы харавога класа за год для студэнтаў дзённай формы навучання складае 20–25 харавых твораў.

У якасці эфектыўных педагагічных методык, якія садзейнічаюць кіраванню ведамі, а таксама набыццю вопыту самастойнага вырашэння рознабаковых задач, неабходна адзначыць метады вакальнай работы ў хоры:

– канцэнтрычны,

– фанетычны,

– тлумачальна-ілюстрацыйны ў спалучэнні з рэпрадукцыйным,

– параўнальнага аналізу,

– унутранага інтанавання.

Для кантролю за ведамі навучэнцаў у кожным семестры рэкамендуецца праводзіць залік ці экзамен, дзе ўлічваецца работа студэнта ў харавым класе. Ацэньваюцца веды харавых партый твораў, авалоданне пеўчымі і музыкальна-слыхавымі навыкамі, прадугледжанымі праграмай харавога класа; разуменне стылю, ідэйна-мастацкага зместу твораў; творчая актыўнасць у працэсе работы і ўдзел у канцэртных выступленнях.

Рэкамендавана заканчваць вывучэнне курса дзяржаўным экзаменам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін |
|---|---|
| | практ. заняткі |
| 1. Галасавы апарат. Гігіена голасу і галасавы рэжым | 1 |
| 2. Пеўчыя галасы і іх класіфікацыя. Элементы пеўчага голасу. Арганізацыя работы харавога класа. Расстаноўка харавога калектыву | 4 |
| 3. Авалоданне асноўнымі прыёмамі акадэмічнай манеры спеваў. Пеўчая ўстаноўка. Гукаўтварэнне, гукавядзенне ў акадэмічным хоры | 70 |
| 4. Дыханне ў харавым выкананні | 68 |
| 5. Распяванне ў хоры | 82 |
| 6. Атака гуку як сродак мастацкай выразнасці і тэхнікі вакальна-харавога майстэрства | 48 |
| 7. Пашырэнне дыяпазону галасоў харавых партый. Згладжванне і спалучэнне рэгістраў | 46 |
| 8. Строй у хоры | 82 |
| 9. Дыкцыя ў харавым выкананні | 84 |
| 10. Ансамбль у хоры | 86 |
| 11. Харавыя творы розных стыляў і жанраў | 70 |
| 12. Тэмп у харавых творах | 81 |
| 13. Авалодванне выкананнем харавых твораў розных тыпаў фактуры | 62 |
| 14. Музычна-паэтычны вобраз, мастацкі змест, музычная фраза ў харавых творах. Развіццё вакальна-харавых і выканальніцкіх навыкаў | 78 |
| 15. Канцэртнае выкананне харавой праграмы | 108 |
| Усяго… | 970 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

***Тэма 1. Галасавы апарат. Гігіена голасу і галасавы рэжым***

Функцыянальны прынцып будовы галасавога апарату. Узаемадзеянне гартані і дыхальнага апарату.

Гукаўтваральны і артыкуляцыйны аддзелы галасавога апарату (глотка, ротавая поласць, поласць носа).

Роля рэзанатараў. Гігіена голасу і галасавы рэжым. Жыццёвы і прафесійны рэжым, азначаныя гігіенічныя правілы. Распарадак працы, адпачынку, харчавання, фізічных практыкаванняў і інш. Неўралагічна-псіхічная нагрузка.

***Тэма 2. Пеўчыя галасы і іх класіфікацыя. Элементы пеўчага голасу. Арганізацыя работы харавога класа. Расстаноўка харавога калектыву***

Класіфікацыя галасоў харавых партый:

партыя *сапрана* – лірыка-каларатурнае, лірычнае, драматычнае;

партыя *альтоў* – лірычнае і драматычнае мецца-сапрана, кантральта;

партыя *тэнараў* – лірычныя і драматычныя тэнары;

партыя *басоў* – драматычныя і лірыка-драматычныя барытоны, бас, актавісты.

Элементы пеўчага голасу: сіла гуку, тэмбр, палётнасць, пявучасць, дыханне, дыяпазон.

Падбор вучэбнага і канцэртнага рэпертуару з улікам вакальна-тэхнічнага і мастацкага ўзроўню калектыву. Харавыя творы розных жанраў, стыляў. Папярэдні аналіз музычнага і паэтычнага тэксту сачынення. Аналіз сродкаў музычнай выразнасці. Трактоўка харавога твора.

Арганізацыя работы харавога класа.

Расстаноўка хору (класічная і інш.). Рэверберацыя памяшкання.

***Тэма 3. Авалодванне асноўнымі прыёмамі акадэмічнай манеры спеваў. Пеўчая ўстаноўка. Гукаўтварэнне, гукавядзенне ў акадэмічным хоры***

Пеўчая ўстаноўка – свабоднае трыманне корпуса, шыі, галавы, артыкуляцыйнага апарату як асновы гукаўтварэння і гукавядзення, пеўчага дыхання, натуральнага фарміравання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зычных і галосных, высокай пазіцыі гуку, адзінай манеры акадэмічнага гукаўтварэння (роўнасць тэмбравай афарбоўкі). Спяванне мяккім, не фарсіраваным гукам на падставе пявучага гукавядзення.

***Тэма 4. Дыханне ў харавым выкананні***

Фазы і тыпы пеўчага дыхання. Выкарыстанне дыхання ў залежнасці ад даўжыні музычнай фразы і мастацкіх патрабаванняў. Ніжняроберная – дыяфрагмальнае дыханне як найбольш аптымальнае для вакальна-харавых спеваў. Бязгукавыя практыкаванні. Выкарыстанне розных гімнастык (артыкуляцыйнай і дыхальнай).

Гукавыя практыкаванні. Авалоданне пеўчым дыханнем і яго развіццё.

***Тэма 5. Распяванне ў хоры***

Распяванне – падрыхтоўка галасавога апарату да спеваў, развіццё вакальна-харавых навыкаў. Даўжыня распявання, прынцып паступовасці, дыяпазон, дынаміка, гукавышыннасць, эмацыянальнасць.

Тыпы вакальных практыкаванняў: з розным рытмічным малюнкам, гукавядзеннем, голасавядзеннем, штрыхамі, гарманічныя паслядоўнасці (інтэрвалы, акорды), вакалізы, урыўкі з харавых твораў.

***Тэма 6. Атака гуку як сродак мастацкай выразнасці і тэхнікі вакальна-харавога майстэрства***

Атака гуку як сродак мастацкай выразнасці і вакальнай тэхнікі ў суадносінах са зместам і характарам харавога твора, сродак уздзеяння на галасавы апарат. Засваенне ўсіх відаў атакі: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Аснова гукаўтварэння – мяккая атака. Прыдыхальная атака як сродак выпраўлення жорсткасці гукаўтварэння. Цвёрдая атака як сродак выпраўлення млявасці гукаўтварэння.

***Тэма 7. Пашырэнне дыяпазону галасоў харавых партый. Згладжванне і спалучэнне рэгістраў***

Згладжванне і спалучэнне рэгістраў. Вакальна-харавыя практыкаванні. Прынцып паступовасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пашырэнне дыяпазону галасоў за кошт згладжвання рэгістраў пры захаванні тэмбравай афарбоўкі.

Вольнае авалодванне ўсімі рэгістрамі галасоў. Выкананне твораў з развітой шматгалоснай фактурай, дзе выкарыстоўваецца гучанне ўсіх рэгістраў галасоў.

***Тэма 8. Строй у хоры***

Асаблівасці выканання меладычнага і гарманічнага строю. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. Авалодванне навыкамі дакладнага інтанавання меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў.

Авалодванне чыстатой інтанавання за кошт разумення ладагарманічнай структуры і эмацыянальна-вобразнага зместу твора.

Залежнасць харавога строю ад гукаўтварэння, тэсітуры, ансамбля, тэмпу, дыкцыі.

***Тэма 9. Дыкцыя ў харавым выкананні***

Асаблівасці вакальна-харавой дыкцыі.

Пеўчая артыкуляцыя. Зычныя і галосныя гукі ў спевах. Асаблівасці пеўчай арфаэпіі. Логіка пабудовы музычнай і паэтычнай фразы. Асэнсаванне суадносін зместу і характару паэтычнага тэксту. Спецыфіка работы над дыкцыяй у творах з меладычным, гамафонна-гарманічным выкладаннем. Рэдукаванне галосных у спевах. Дэкламацыя паэтычнага тэксту.

***Тэма 10. Ансамбль у хоры***

Засваенне і развіццё навыкаў спеваў у ансамблі. Уменне знаходзіць суадносіны гучання голасу па інтанацыі, дынаміцы, тэмбру, метрарытму, агогіцы, артыкуляцыі, дыкцыі з іншымі выканаўцамі ў харавой партыі.

Ужыванне розных практыкаванняў для ўдасканальвання вакальна-харавой тэхнікі падчас працы над дынамічным, метрарытмічным, дыкцыённым, тэмбравым, артыкуляцыйным ансамблямі. Суадносіны якаснага і колькаснага складу галасоў у харавых творах.

***Тэма 11. Харавыя творы розных стыляў і жанраў***

Вывучэнне харавых твораў розных жанраў і стыляў. Разуменне і асэнсаванне іх асаблівасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Авалодванне навыкамі выканання разнастайнай дынамікі, агогікі, фанічных эфектаў, розных штрыхоў, тэмбральнага ансамбля з мноствам адценняў харавога гуку.

***Тэма 12. Тэмп у харавых творах***

Авалодванне навыкамі спявання харавых твораў у розных тэмпах. Рытмічная пульсацыя, тэмпавыя адхіленні, агогіка, цэльнасць формы, музычны вобраз, эмацыянальны настрой.

***Тэма 13. Авалодванне выкананнем харавых твораў розных тыпаў фактуры***

Засваенне і развіццё навыкаў выканання харавых твораў з рознымі тыпамі фактуры (меладычнай, гарманічнай, поліфанічнай).

Разуменне і асэнсаванне функцый галасоў у харавой партытуры.

Работа над унісонам (мелодыка-манадычная фактура).

Роля ансамбля пры выкананні мелодыка-падгалосачнай, гамафонна-гарманічнай, поліфанічнай фактур.

***Тэма 14. Музычна-паэтычны вобраз, мастацкі змест, музычная фраза ў харавых творах. Развіццё вакальна-харавых і выканальніцкіх навыкаў***

Папярэдняя работа пад мастацкім вобразам, мастацкім зместам харавога сачынення. Разуменне музычнай фразы, сэнс і логіка яе пабудовы. Замацаванне і развіццё атрыманых вакальна-харавых і выканальніцкіх навыкаў, неабходных для раскрыцця вобразна-эмацыянальнага і мастацкага зместу твора. Адзінства і агульнасць перажывання ў калектыўным стварэнні мастацкага вобраза. Выразнасць вымаўлення паэтычнага тэксту як адно з самых важных сродкаў выканальніцкага майстэрства.

***Тэма 15. Канцэртнае выкананне харавой праграмы***

Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену. Падбор праграмы. Рэпетыцыйная работа над партытурай. Узаемасувязь вакальна-тэхнічнай і мастацкай работы над творам.

Прынцып паступовасці асваення харавой партытуры.

Авалодванне неабходнымі сродкамі выканальніцкай выразнасці: якасць гучання, гукавышыннае інтанаванне, тэмпарытм, дынаміка, тэмбр, артыкуляцыя, фразіроўка, агогіка.

Авалодванне неабходнымі сродкамі дырыжорскай тэхнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Асафьев, Б.В.* О хоровой музыке / Б.В.Асафьев. – Л.: Музыка, 1987. – 225 с.

2. *Анисимов, А.* Дирижер – хормейстер / А.Анисимов. – Л.: Музыка, 1976. – 160 с.

3. *Балашов, В.* Поэтическое слово и вокальная интонация. Работа в хоре / В.Балашов. – М.: Музыка, 1977. – 65 с.

4. *Вопросы* вокальной педагогики: сб. ст. – Л.: Музыка, 1982. – Вып. 6. – 180 с.

5. *Емельянов, В.В.* Развитие голоса. Координация и тренаж / В.В.Емельянов. – СПб.: Лань, 2007. – 191 с.

6. *Живов, В.* Хоровое исполнительство / В.Живов. – М.: Владос, 2003. – 272 с.

7. *Живов, В.* Теория хорового исполнительства / В.Живов. – М.: Эдиториал УРСС, 1998. – 288 с.

8. *Живов, В.* Трактовка хорового произведения / В.Живов. – М.: Сов. Россия, 1986. – 126 с.

9. *Иконникова, Л.Н.* Интерпретаторская культура хорового дирижера / Л.Н.Иконникова; науч. ред. Ю.Д.Златковский. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2005. – 143 с.

10. *Левандо, П.П.* Хороведение. Основы вузовского курса / П.П.Левандо. – Л.: Музыка, 1971. – 280 с.

11. *Левандо, П.П.* Анализ хоровой партитуры / П.П.Левандо. – Л.: Музыка, 1965. – 55 с.

12. *Кееριг, О.П.* Хороведение: учеб. пособие / О.П.Кееριг. – СПб.: СПбГУКИ, 2004. – 187 с.

13. *Малышева, Н.М.* О пении: метод. пособие (Из опыта работы с певцами) / Н.М.Малышева. – М.: Музыка, 2001. – 168 с.

14. *Менабени, А.Г.* Методика обучения сольному пению / А.Г.Менабени. – М.: Просвещение, 1987. – 95 с.

15. *Минин, В.* К проблеме подготовки дирижеров хора / В.Минин // Труды ГМПИ им. Гнесиных. – М., 1975. – Вып. 19. – 17–26 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Морозов, В.П.* Искусство резонансного пения / В.П.Морозов. – М.: Моск. гос. консерватория им. П.И.Чайковского, 2002. – 145 с.

*17. Осеннева, М.С.* Хоровой класс и практическая работа с хором / М.С.Осеннева, В.А.Самарин. – М.: Академия, 2003. – 192 с.

*18. Соколов, Вл.* Работа с хором. – 2-е изд. / Вл.Соколов. – М.: Музыка, 1983. – 192 с.

*19. Пигров, К.* Руководство хором / К.Пигров. – М.: Музыка, 1964. – 217 с.

*20. Чесноков, П.Г.* Хор и управление им. – 3-е изд. / П.Г.Чесноков. – М.: Гос. муз. изд-во, 1961. – 239 с.

*Дадатковая*

*1. Бугасов, С.* Душе моя: произведения для смешанных составов хоров / С.Бугасов. – Мн.: Изд. Вараксин А.Н., 2009. – 112 с.

*2. Век маладосці*: харавыя цыклы беларускіх кампазітараў / укл. А.А.Свірыдовіч. – Мн.: Зорны верасень, 2009. – 188 с.

*3. Вопросы* вокальной педагогики: сб. ст. – Л.: Музыка, 1982. – Вып. 6. – 180 с.

*4. Гажэўская, Т.С.* Табе, Прачыстая Багародзіца! / Т.С.Гажэўская. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 327 с.

*5. Гукі* Бацькаўшчыны / уклад. А.А.Свірыдовіч. – Мн.: Тэхнапрынт, 2004. – 216 с.

*6. Гэта* наша Радзіма: вакальныя творы беларускіх кампазітараў на вершы У.Карызны / укл. С.Ярохіна. – Мн.: Беларусь, 1998. – 120 с.

*7. Духоўная* харавая музыка / уклад. А.В.Пякуцька, З.Л.Леановіч, В.П.Маеўская. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1996. – 156 с.

*8. Ерохина, С.К.* Хоровой класс и хор в школе. Хоровая музыка XVI–XVIII вв. / С.К.Ерохина. – Мн.: Мастацкая літаратура, 2008. – 143 с.

*9. Как* прекрасен этот мир! / сост. Б.Кожевников. – Мн.: Беларусь, 2002. – 232 с.

*10. Каціўся* вяночак: бел. нар. песні / укл. А.А.Свірыдовіч. – Мн.: Выд. Вараксін А.М., 2006. – 72 с.

*11. Назарова, Е.П.* Хоровой практикум: учеб.пособие. – Мн.: БГПУ, 2002. – 157 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Нова* радасць стала / уклад. А.Пякуцька, З.Леановіч, В.Маеўская. – Мн.: БелІПК, 1995. – 59 с.

*13. Памяти* А.В.Свешникова. Статьи. Воспоминания / сост. С.С.Калинин. – М.: Музыка, 1998. – 328 с.

*14. Салавей* спявае: хары, песні на вершы У.Карызны / укл. С.Ярохіна. – Мн.: Беларусь, 1990. – 160 с.

*15. Сокровищница* русской духовной музыки / сост. Б.Г.Тевлин. – М.: Музыка, 2000. – 167 с.

*16. Харавы* канцэрт / уклад. А.Пякуцька, Я.Рэутовіч, З.Леановіч, В.Маеўская. – Мн.: Беларусь, 1999. – 167 с.

*17. Харавая* музыка: апр. бел. нар. песень / уклад. А.В.Пякуцька, З.Л.Леановіч, В.П.Маеўская. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1996. – 236 с.

*18. Хоровой концерт*: произведения зарубежных композиторов XVI–XX вв. / сост. С.Ерохина. – Мн.: Лимариус, 2000. – 176 с.

*19. Чабарок:* рэпертуарны зборнік для хароў і вакальных ансамбляў / уклад. Л.Ярашэвіч, С.Ярохіна. – Мн.: Ін-т праблем культуры, 1991. – 72 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТАК

## Прыкладны рэпертуар

### *Змешаны хор*

*Апрацоўкі беларускіх народных песень*
*і творы беларускіх кампазітараў*

*Алоўнікаў У*. На Палессі гоман, гоман.

*Атрашкевіч А*. Юрачка (апр.). Да Маці Божай Будслаўскай.

*Багатыроў А*. Зайшло сонца за ваконца.

*Багатыроў А*. Праляцелі вятры.

*Вагнер Р*. Дуб.

*Гайваронскі М*. Ой, гукнула сыраежка (апр.).

*Галкоўскі М*. Хары "Ой, дай жа, Божа...", "Ой, знаці, знаці..." з сюіты "Каханне".

*Дамарацкі У*. Шчаслівы дзень.

*Картэс С*. Будзе навальніца.

*Карызна У*. Вечар.

*Карызна У*. Таемнасць цішыні.

*Кузняцоў І*. Зямля бацькоў.

*Мдзівані А*. Харавы цыкл "Снапочак". "Запалі, матка, свечку" з сюіты "Вясельныя песні". Ой, пара дамоў, пара.

*Наско Э*. Асветнікі. Роздум на пачатку трэцяга тысячагоддзя. Бацькоўскі край. Вечны агонь. Ратуй нас, Божа.

*Пукст Р*. Партызанскія акопы.

*Рэутовіч Я*. Там, каля млына (апр.). Ці свет, ці світае (апр.). Саўка ды Грышка. Ты, белая бярозанька.

*Семяняка Ю*. Хатынскія званы. Крыніцы. Зімовы лес. Ах ты, зімачка-зіма.

*Туранкоў А*. Канцэрт для хору "Торжествуйте днесь". Хваліце імя Госпадне. Туча. Ручай. Падвей.

### *Змешаны хор*

*Творы рускіх, заходнееўрапейскіх*
*і сучасных кампазітараў*

*Архангельский А*. Концерт для хора "Помышляю день страшный". Когда печаль. 101 псалом.

*Аренский А*. Татарская песня.

*Бортнянский Д*. Концерт для хора "Сей день".

*Вивальди А*. Gloria.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Верди Дж.* Реквием (отдельные номера). Stabat Mater. Te deum.

*Галынин Г.* Оратория “Девушка и Смерть” (отдельные номера).

*Глинка М.* Интродукция из оперы “Иван Сусанин”.

*Рахманинов С.* Итальянская полька (обр. А.Егорова).

*Давиденко А.* Бурлаки. Море яростно стонало. Узник. Улица волнуется. На десятой версте.

*Джерхарт Л.* Сухие кости (обр.).

*Коваль М.* Слезы.

*Людиг М.* Лес.

*Моцарт А.* Мессы C dur.

*Мельник И.* Под Хатынью колокола.

*Орф К.* Кантата “Кармина Бурана”.

*Прокофьев С.* Песня об Александре Невском. Вставайте, люди русские, из кантаты “Александр Невский”.

*Парцхаладзе М.* Озеро. Вечер.

*Рахманинов С.* Поэма “Колокола” (отдельные номера). Кантата “Весна”. Три русские песни. “Огни потушены” – хор из оперы “Алеко”. Богородице дево, радуйся (из “Всенощного бдения”).

*Сахновский Ю.* Ковыль.

*Свешников А.* В темном лесе (обр.). Вниз по матушке по Волге (обр.).

*Танеев С.* Посмотри, какая мгла. Вечер. Серенада. Венеция ночью. Альпы. Восход солнца. Развалины башни – жилище орла. Из края в край.

*Ушкарев М.* Думы, мои думы. О человек, ликуй и пой. На смерть Лауры.

*Флярковский А.* Сверстникам моим. Хоры из цикла “Ленинградская тетрадь”. Сюита “Четыре белорусские песни”.

*Чесноков П.* Август. Альпы. Дубинушка. Теплится зорька. Не цветочек в поле вянет.

*Шестакович Д.* Поэма “Казнь Степана Разина”. Хоры из сочинения “Десять поэм”. Как меня младу-младешеньку (обр.).

*Щедрин Р.* Четыре хора на стихи А.Твардовского. Четыре хора на стихи А.Вознесенского. Ива-ивушка. Тиха украинская ночь.

*Штраус И.* Весна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### ***Жаночы хор***

*Апрацоўкі беларускіх народных песень*

*Аладаў М.* Веюць ветры.

*Васючкоў М.* Як выведу луку.

*Грэчанінаў А.* Чаму селязень смуцен, невясёл.

*Гуляеў В.* Дзе мы ходзім. Дражнілка. Ішоў казак дарогаю. Маслёнка. Пры даліне ў гушчары.

*Кажэўнікаў Б.* Жавароначкі, прыляціце. Ой, рэчанька. Сядзіць камар на дубочку. Беларускі вяночак.

*Калыганаў В.* Янка.

*Клеванец А.* А ў нашай вёсцы.

*Корсак М.* Ідзе, ідзе карагод. Купалінка.

*Наско М.* Нарадзіла мяне маці. Ой, дзе ж мы ходзім. Сею я лён.

*Рашчынскі А.* З-пад белага камушка. Ой, там на гары. Туман, туман, матушка. Што то за хлопец, што за дзяўчына.

*Рэутовіч Я.* Купалінка. Ой, у лесе. Рэчанька. Саўка ды Грышка.

*Семяняка Ю.* Ой, у лесе. Там каля млына.

*Цітовіч Г.* Ды ў зялёнай дубраве.

### ***Жаночы хор***

*Творы рускіх кампазітараў*

*A cappella (духоўная музыка)*

*Архангельский А.* Трисвятое. Святый Боже. Заупокойная ектиния. Когда печаль.

*Бортнянский Д.* Да исправится молитва моя (d moll). Да исправится молитва моя (e moll). Херувимская песнь. Херувимская № 4.

*Варламов А.* Белеет парус одинокий, обр. Г.Беззубова.

*Глинка М.* Хор цветов из оперы “Руслан и Людмила”.

*Глиэр Р.* Весна. Осень.

*Гречанинов А.* Весна. Ты запой, жавороночек. Черемуха. Ноктюрн.

*Даргомыжский А.* На севере диком. Зимний вечер. Сосна. Ночевала тучка золотая, перелож. А.Луканина. Хоры русалок из оперы “Русалка”.

*Ипполитов-Иванов М.* Листья в саду шелестят. Ночь. Тебе поем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Кастальский А*. Отче наш. Единородный сыне. Вместо причастия.

*Кюи Ц*. Омывшись на заре. Весеннее утро. Гроза. Всюду снег. Пусть смятенье и гром. Вербы.

*Рахманинов С.* Ангел. Сирень. Ночка. Сосна. Задремали волны. Неволя.

*Римский-Корсаков Н.* Ночевала тучка золотая. Тучки небесные.

*Рубинштейн Н*. Трио из оратории “Потерянный рай”.

*Танеев С*. “Слава Зевсу” – № 2 из оперы “Орестея”.

*Чайковский П.* Девицы-красавицы (из оперы “Евгений Онегин”).

*Чесноков П.* Отче наш. Придите, ублажим Иосифа. Милость мира. Яблоня. Крестьянская пирушка. Утром зорька. Распустилась черемуха. Солнце, солнце встает. Листья. Лотос. Ходят в небе потихоньку. Катит весна.

***Жаночы хор***

*Творы замежных кампазітараў*

*Бах И.-С*. Терцет из Мотета. Ночь отошла бесследно.

*Бриттен Б.* A Ceremony of Carols. Processlon. Wolcum Voie. There ino Rose. Bulalalo.

*Вивальди А*. Gloria.

*Куперен Ф*. In praise of God.

*Мендельсон-Бартольди Ф*. Мотет Veni Domine. Хор народа “Опять весна” из оперы “Вальпургиева ночь”. Laudate pueri. Hebe deine Augananf – из оратории “Илия”.

*Моцарт В*. Баркарола.

*Сен-Санс Ш*. Ave verum. Ave Maria. Хор девушек – из оперы “Самсон и Далила”.

*Скандelli А*. Bonzorno Madonna.

*Шуберт Ф.* Серенада. Бог в природе. Баркарола. Got ist mein Heart. Утренняя серенада.

***Жаночы хор***

*Творы сучасных кампазітараў*

*Бремер Ж*. Bambaja barabat.

*Гомес В*. Романс.

*Кузняцоў І.* Балада пра маці.

*Кур’ян У*. Малітва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літвін М.* Ніцыя вербы. Ружовы бусел.

*Наско Э.* Валачобная. Ой, спяваў у вербах салавейка. Ты бачыў край? Ходзіць каток.

*Подгаец Е.* Роза. Туча.

*Рашчынскі А.* Купаленка.

*Свидер Ю.* Kirie eleson. Sanctus. Agnus Dei.

*Сімаковіч Л.* Ішла Купала.

*Славкин М.* Лицо вечера. Музыкальное упражнение. Мои облака.

*Солтан У.* Первый снег.

*Сурус Т.* Концерт “Весенний”.

*Удовицкий В.* Туча. Зима. Вечер года.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ХАРАВЫ КЛАС**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць*
*(харавая музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-01 01 Харавая музыка акадэмічная*

Рэдактар І.В.Смяян
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,11. Ул.-выд. арк. 0,72.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ